фанабэрыстасцю. Аб гэтым многія з іх напісалі ў сваіх успамінах. Праўдзівае аблічча мастака праступае і з яго ўласных лістоў, што сёння захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Літоўскай Рэспублікі. З іх старонак паўстае чалавек дзівосна прыгожай і тонкай душы, хаця, як і ў большасці таленавітых людзей, вельмі складанай і ўражлівай.

Уся багатая творчая спадчына маэстра Валенція, як звалі мастака сябры, сёння раскідана па многіх краінах. Яго карціны, накіды, малюнкі захоўваюцца ў лепшых музеях Вільнюса, Пецярбурга, Варшавы, Кракава, Парыжа. Мінск, на жаль, гэтым пахваліцца не можа.

*У артыкуле разглядаецца праблема дыскрэтнасці прафаннага часу і трансфармацыі яго ў сакральны. Паказваецца, што ў фальклорнай традыцыі беларусаў існавала некалькі форм суаднесенасці часавых вектараў і некалькі ступеней іх сітуатыўнай падпарадкаванасці.*

# АСАБЛІВАСЦІ СУІСНАВАННЯ САКРАЛЬНАГА І ПРАФАННАГА ЧАСУ

## Традыцыйная практыка беларусаў



**А. В. Катовіч,**
старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уміфах і вусна-паэтычнай спадчыне беларусаў існавалі рознаўзроўневыя адносіны паміж рознымі структурнымі адзінкамі асэнсавання і парадкавання часу. Тыдзень суадносіўся з каляндарным годам і фазамі Месяца, дзень – з порамі года і структурай тыдня або каляндарнага месяца. Аднак самы складаны спектр узаемасувязей склаўся вакол дня, які факусіраваў у сабе ўсю вертыкаль суаднесенасці, уключаючы не толькі структуру тыдня, месяцовую цыклічнасць, характарыстыкі звычайнага або высакоснага года, але і жыццёвы шлях чалавека ці Рода.

### ✍ Узаемаадносіны хранонімаў

Значна большая колькасць **каштоўнасных характарыстык часу ў міфапаэтычнай спадчыне беларусаў** звязана з аксіялогіяй дня і тыдня як асобных структурных адзінак. Яны ўваходзілі ў самыя рознабаковыя і складаныя ўзаемаадносіны з іншымі хранонімамі, якія вызначалі розныя адрэзкі парадкавання часу. Дакладней сказаць, не столькі сам па сабе дзень або тыдзень увабралі ў сябе шырокую палітру характэрных адценняў, колькі шматслойныя напластаванні розных фактараў ускладнялі іх каштоўнасную характарыстыку. Так, на Палессі пара збору ўраджаю атрымала назву «дзельнае ўрэмя» [9, с. 89], а другі тыдзень Вялікага посту звалі «глухі тыждзень» [9, с. 61], аднак калі такі час суадносіўся з фазамі Месяца, то характарыстыка станавілася шматпланавай. Тыдзень пасля поўні атрымаў назву «гнілое ўрэмя» [9, с.62], а перыяд «сходу» – апошнія дні Месяца, назвалі «крайнімі днямі» [9, с. 125], і наадварот, пачатак маладзіковай фазы лічыўся спрыяльным, таму гэтыя дні характарызаваліся як «крэпкія» [9, с. 126].

М. Эліадэ канстатуе: «Свяшчэнны час... з'яўляецца першасным міфічным Часам, пераўтвораным у цяперашні. Усякае царкоўнае свята, усякі Час літургіі ўяўляе сабой аднаўленне ў цяперашнім якой-небудзь свяшчэннай падзеі, якая адбывалася ў свяшчэнным мінулым, «на пачатку». Рэлігійны ўдзел у якім-небудзь святы мае на мэце выхад са «звычайнай» часавай працягласці для аднаўлення міфічнага Часу, выведзенага ў цяперашні самім святам. Такім чынам, Свяшчэнны Час можа быць адноўлены і паўтораны бясконцае мноства разоў» [11, с. 48]. Навуковец падае агульную схему абнаўлення сакральнага часу, але не адказвае на пытанне аб тым,

якія падзеі або фактары міфічнай даўніны ці больш позняга часу паўплывалі на з'яўленне неспрыяльных дзён і іх паслядоўнае размеркаванне на працягу каляндарнага года. Для таго каб зразумець механізм размыкання гамагеннага прафаннага часу і напаўнення перыяду бязладдзя (руск. – «безвременье») інтэнцыяй святочнай выключнасці або мадэлявання міфічнага падабенства, паспрабуем дэталёва акрэсліць вызначальныя паняцці асэнсавання і парадкавання часу ў кантэксце сакральнага і прафаннага памежжа.

**Сакральны час** – гэта той час, які ахоплівае ўвесь перыяд правядзення таго ці іншага абраду, пры гэтым маецца на ўвазе, што ён, як правіла, складаецца з трох асноўных этапаў: падрыхтоўчага (напрыклад, перадвясельны этап, час агоніі паміраючага чалавека, перадродавы час), уласна абрадавага, нарэшце, часу завяршальных абрадаў. А. Я. Леўкіеўская адзначае, што для сакральнага часу характэрны асаблівы тып паводзін, які ўключае вялікую колькасць забарон на працу, абавязковае наведванне культавых месцаў, патрабаванне апранаць святочнае (!) адзенне, гатаваць адпаведныя стравы [5, с. 537]. Зразумела, што сакральны час даволі часта **атаясамліваюць з абрадавым часам**.

Услед за Ван Генепам, які даследаваў «абрады пераходу», фалькларысты і этнографы пачалі карыстацца паняццем «парогавы час».

**Парогавы час** – гэта своеасаблівы кульмінацыйны момант, важная крытычная мяжа ў часавым развіцці абрадавых падзей, у кантэксце якіх прынцыпова змяняўся статус асноўных удзельнікаў абраду. Прычым у дадзеным выпадку мэтазгодна гаварыць аб тым, што парогавы стан аб'ядноўваў у хранатопныя адносіны і час і прастору. Так, падчас вяселля (сакральны, абрадавы час) былі «кропкі» так званага парогавага часу: жаніха і нявесту ўсаджвалі на дзяжу; жаніх пераносіў нявесту цераз парог бацькоўскай хаты на руках; першая шлюбная ноч і г. д. Зразумела, што паняцце **парогавы час** пэўным чынам карэлюецца з локусам парога ў абрадавай практыцы. Напрыканцы Калядаў на парозе секлі венік-дзяркач на тры часткі (што адпавядала структуры самога рытуальна-абрадавага комплексу) [5, с. 96], на парог клалі аладкі, якія павінен быў схапіць сабака і прадказаць дзяўчатам хуткае замужжа. Перад тым, як вынесці труну з нябожчыкам з хаты, яе тройчы апускалі на парог. Гэта быў знак прадстаўнікам іншасвету: «Прымайце наступнага з нашага роду!» Зразумела, чаму непасрэдна ў кантэксце вяселля гэта зона аказвалася недатыкальнай.

Такім чынам, **абрадавы час ахопліваў** усю **сферу святочных падзей,** а **парогавы фіксаваў** толькі **кропкі статусных трансфармацый**, прынцыповых змен у жыцці ўдзельнікаў абрадавых падзей. Менавіта парогавы час патрабаваў актыўнага ўключэння механізма сацыянарматыўнага рэгулявання, уводзіў вялікую колькасць абмежаванняў і забарон.

**Прафанны** – гэта абыдзённы, паўсядзённы, дэсакралізаваны, пазаабрадавы час. Для таго каб больш выразна ўявіць сабе, як прафанны час трансфармуецца ў сакральны, нам пажадана апынуцца на вясковай вуліцы. Калі А. К. Байбурын ставіць пытанне аб стварэнні ўніверсальнай структуры абраду, ён адзначае, што рытуал скіраваны на падтрыманне раўнавагі свету (космасу, вясковай абшчыны, любога соцыуму). А **хто**, уласна кажучы, **запускае механізм аднаўлення**, хто падае каманду, што мінулая падзаводка абрадавага гадзінніка вычарпала свой прадугледжаны рэсурс?

Калі ў хрысціянскай традыцыі механізм аднаўлення абапіраецца на храналогію падзей зямнога жыцця, смерці і ўваскрэсення Ісуса Хрыста і Маці Боскай, то ў традыцыйнай культуры такіх каардынатараў вядома некалькі. Па-першае, гэта рух нябесных свяціл, які прадвызначаў каляндарныя падзеі, па-другое, старэйшыя члены роду або сям'і (практыка сямейна-родавых абрадаў), па-трэцяе, знаўцы магічных аспектаў традыцыі ў абрадах аказіянальнага характару, па-чацвёртае, людзі, якія маюць самае непасрэднае дачыненне да сутнасці распачынаемай абрадавай дзеі.

## Шматслойнасць часу ў фальклорнай традыцыі

Часам здараецца так, што нават ў жорсткую форму планавання маючых адбыцца падзей мы вымушаны ўносіць карэктывы, звязаныя з абставінамі выключнай значнасці, якія надараюцца ў межах існавання таго ці іншага соцыуму, напрыклад, прыродныя катаклізмы, смерць каго-небудзь з блізкіх людзей. Плынь жыццёвага часу набывае рознаўзроўневы характар суіснавання. Гэта з'ява з даўніх часоў была вядома і па-рознаму асэнсоўвалася ў міфапаэтычнай спадчыне і каляндарнай абраднасці нашых продкаў.

Прадстаўнікі прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных навук пастаянна падкрэсліваюць адзінства суіснавання часу і прасторы, якія ўтвараюць чатырохмерны кантынуум, у межах якога разгортваюцца ўсе падзеі на Зямлі. Філасофскім эквівалентам чатырохмернай экзістэнцыі стала квінтэсенцыя «тут і зараз». Прынцыпы структуравання прасторы шмат у чым нагадвалі і характар парадкавання часу. У народных казках і паданнях перад тым, як пакінуць межы гэтага свету і трапіць ва ўладанні прадстаўнікоў іншасвету, герой павінен выканаць шэраг адпаведных дзеянняў пераходнага характару: апусціцца ў калодзеж; пралезці праз аслінае (конскае, кароўе) вуха...

Нешта аналагічнае павінна было адбывацца і з часам, каб ён з прафаннага трансфармаваўся ў сакральны. Гэты механізм меў розныя ўмовы, фактары, акалічнасці. Напрыклад, вядома дакладная прымеркаванасць да пэўнага часу сутак: абвяшчэнне падзеі ўваскрэсення Хрыста супадала з поўначчу велікоднай ночы; адпраўной кропкай першага выгану каровы на пашу быў узыход сонца на Юр'я; хаваць памёршага нельга было пасля захаду сонца і інш.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Аднак шматлікія кантэксты фальклорных твораў і абрадавых падзей сведчаць аб тым, што трансфармацыя прафананнага часу ў сакральны і парогавы даволі часта абумоўлена некалькімі космапланетарнымі рытмамі. Так, святкаванне Вялікадня было самым непасрэдным чынам звязана з вясновым раўнадзенствам, першай поўняй, якая надыходзіла пасля яго і бліжэйшай пасля гэтага нядзеляй. Той самы алгарытм **канвенцыянальнасці або напластавання розных вектараў часу** характэрны і для святкавання Калядаў.

## Дыскрэтнасць часу

**Дыскрэтны час** – значыць час разарваны, час, у якім утварыліся лакуны. Мы прызвычаены да таго, што ў хрысціянскай традыцыі час мае вектарную накіраванасць: ад Раства Хрыстова і да нашых дзён. У міфалагічных уяўленнях нашых продкаў ён меў закальцаваны характар. Прыродны колазварот задаваў адпаведны рытм, звязаны са зменай пораў года, а ён (рытм), у сваю чаргу, фіксаваўся адпаведнымі адрэзкамі часу. Паводле меркавання некаторых навукоўцаў, закальцаванасць міфалагічнага або каляндарнага часу ўсё роўна прадугледжвала пэўную лінейную вектарнасць на кожным канкрэтным этапе існавання соцыуму.

У такім разе нас цікавяць дзве найважнейшыя метадалагічныя праблемы: механізм дыскрэтнасці прафаннага часу і механізм ператварэння яго ў сакральны і больш за тое – дыскрэтнасці самога сакральнага часу. Жанчыны в. Забалоцце Уздзенскага раёна расказалі нам: каб правесці аказіянальны абрад выклікання дажджу (некалькі тыдняў стаяла спякота), збіраліся шэсць удоў і раніцай, на ўзыходзе сонца, абыходзілі вёску і сыпалі мак у дзевяць калодзежаў, пры гэтым ім забаранялася размаўляць. Надзвычайныя абставіны запатрабавалі «разарваць» плынь прафаннага часу і запусціць механізм актуалізацыі абрадавага часу, у межах якога будуць выкананы дзеянні, скіраваныя на прымусовае змяненне стану прыроды і гарманізацыі жыццядзейнасці соцыуму. Яшчэ адзін прыклад паказвае, якім чынам адбываецца спыненне абрадавага часу. Аднак у гэтым выпадку адбываецца не столькі канвенцыялізацыя часавых узаемаадносін, колькі выцясненне аднаго вектару развіцця абрадавых падзей іншым. Так, калі ў сям'і здарылася бяда, нехта паміраў, то гэта сям'я выпадала з адной плыні часу – каляндарнай (святочнай) – і пераходзіла зусім ў іншую плоскасць часу, якая таксама будзе ахопліваць адрэзак часу даўжынёй у год. На працягу года пасля смерці роднага чалавека паводзіны членаў яго сям'і падпарадкаваны рэгламентацыям памінальнай абраднасці, надзеленых выключным статусам сакральнасці.

## Структура часавай іерархіі

Каб лепш зразумець **структуру часавай іерархіі або ступеней падпарадкаванасці часавых вектараў**, нам неабходна перанесціся на анталагічную плоскасць прасторы і ўзгадаць значную колькасць чарадзейных казак, у развіцці сюжэта якіх выкарыстоўваецца прынцып кумулятыўнага назапашвання, або «рэчы ў рэчы», так званай матрошкі: «*У той гары ступа, а ў ступе заяц, у зайцу вутка, у вутцы яйцо, у яйцы смерць мая*!» – адказвае Кашчэй Бессмяротны на пытанне аб знаходжанні яго смерці [10, с. 179]. Перад намі дакладна структураваная мадэль свету, якая пераканаўча сведчыць, што ў міфапаэтычнай спадчыне свет успрымаўся як адзінае цэлае [3, с. 148–149]. Пры гэтым важна адзначыць, што кожны структурны кампанент бачыўся цэнтрам сусвету, і разам з тым акцэнт рабіўся не на тым, што нейкі з пералічаных кампанентаў больш значны або менш важны, а на тым, што свет ёсць такі і ён не можа захоўваць гармонію суіснавання без аднаго з названых кампанентаў.

Вернемся на святочную вясковую вуліцу. З якімі жыццёвымі сітуацыямі маглі сутыкнуцца калядоўшчыкі падчас абходу вёскі? Па-першае, яны павінны былі абмінуць тую хату, у якой у гэтым годзе нехта памёр, – спяваць віншавальныя песні падчас жалобы забаранялася. У вёсках Любонічы і Казулічы Кіраўскага раёна гэта пытанне вырашалася наступным чынам. Гурт спяваў велічальную песню на вуліцы і, не ўступаючы ні ў якія кантакты з прадстаўнікамі гэтай хаты, рушыў далей. Інфарматары тлумачылі гэта наступным чынам: «Усім жа хацелася, каб ім папаялі». Па-другое, калі калядоўшчыкі рабілі абход у дзень праваслаўнага Раства Хрыстова, то не заходзілі ў хаты, дзе жылі каталікі. Таму што там яны пабылі ўжо два тыдні таму.

Яшчэ адзін варыянт напластавання абрадавага часу. За тры месяцы да Вялікдня ў сям'і памёр чалавек. Перад Вялікднем звычайна кожная сям'я фарбуе яйкі ў чырвоны колер, тая ж сям'я, у якой надарылася жалоба, не мела на гэта звычаёвага права – яйкі заставаліся белымі.

А далей жыццёвая сітуацыя ўскладняецца яшчэ больш. Уявім, што праз месяц у гэтай самай сям'і нарадзілася дзіця. Сустрэліся вектары памінальнага і радзільна-хрэсьбіннага часу. Як будуць разгортвацца падзеі далей? Купаць і хрысціць немаўля абавязкова будуць, таксама будуць гатаваць бабіну кашу і спраўляць хрэсьбіны. Аднак падзеі будуць разгортвацца сціпла, стрымана.

## Кампрэсія часу ў практыцы аказіянальных абрадаў

Каляндар жорстка рэгламентаваў паводзіны соцыуму, вымагаючы ад яго кансалідаваных намаганняў для своечасовага падсілкавання гармоніі космасу. Аднак дакладна стуктураваны сакральны каляндар земляроба быў перш за ўсё разлічаны на рытмічную паўтаральнасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

касмічных працэсаў і, адпаведна, тую ж цыклічнасць у жыццядзейнасці соцыуму. Разам з тым здаралася так, што прыродныя катаклізмы выклікалі неабходнасць звароту соцыуму да выканання спецыфічных і спецыяльных аказіянальных абрадаў, скіраваных на аднаўленне сітуацыі гарманічнага суладдзя. М. І. і С. М. Талстыя назвалі гэтыя абрады аказіянальнымі, развіццё сюжэтных падзей у іх разгортваецца па прынцыпе **кампрэсіі часу** [8, с 451]. Перад намі адзін з варыянтаў згортвання космасу ў яйка або паэтычная мадэль куфэрка (матрошкі), якая шырока прадстаўлена ў казачным эпасе беларусаў: казачны герой сапраўды згортвае «той» свет у яйка, кладзе яго ў кішэню і пераносіцца ў свет жывых, дзе выконвае працэдуру разгортвання яйка ў маштабах існавання ў іншасвеце: «*Узяла яйцо, абкатнула кругом. Так гэты дом увабраўся ўвесь чыста ў яйцо. Тады Івашка Мядзведжае вушка ўклаў яго ў кішэнь, і пайшлі*» [10, с. 162].

Матыў кампрэсіі або сімвалічнага згортвання часу шырока прадстаўлены ў абрадавай практыцы ўсходнеславянскіх народаў.

Асабліва шырока матыў кампрэсіі часу прадстаўлены ў аказіянальных абрадах, звязаных з традыцыяй аброкаў. Т. А. Бернштам сведчыць, што каля вытокаў народных «покоянных обетов» стаіць знакаміты феномен «исповедь земле», які ў сярэднявеччы быў адной з пераважных форм калектыўнага хрысціянскага аброку, якая зводзілася да будаўніцтва храма або капліцы ў гонар якога-небудзь святога, каб заручыцца яго дапамогай перад бедствамі [1, с. 89]. У больш позні час пашыранай стала традыцыя кароткатэрміновага прыгатавання абыдзённых прадметаў: ручнікоў-абыдзённікаў, абраканых тканін. Ручнік-абыдзённік выраблялі ў адной хаце за адну ноч або адзін дзень. Да ўдзелу ў сакральным працэсе стварэння абрадавага атрыбута дапускаліся толькі «чыстыя» жанчыны (удовы або тыя жанчыны, якія ўжо не здольны нарадзіць дзіця) або дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту.

Мастацкі прыём кампрэсіі часу шырока прадстаўлены ў фальклорных творах розных жанраў. Напрыклад, у карагодных веснавых песнях аб усіх этапах узгадавання проса, канопляў, далейшага выспявання і, нарэшце, поўнага цыкла перапрацоўкі культурных раслін. Прынцып кампрэсіі абрадавага часу сустракаецца ў значнай колькасці любоўных, жартоўных песень, а таксама ў творах, якія суправаджалі хрэсьбінны абрад.

Такім чынам, аналіз міфапаэтычнай спадчыны беларусаў сведчыць пра тое, што ў ёй прадстаўлены розныя формы ўзаемаадносін прафаннага і сакральнага часу, а механізм трансфармацыі аднаго часу ў іншы мог быць абумоўлены шматлікімі сацыякультурнымі акалічнасцямі і ўмовамі.

## ЛІТАРАТУРА


1. **Бернштам, Т. А.** Молодежь в символизме переходных обрядов восточных славян: учение и опыт Церкви в народном христианстве / Т. А. Бернштам. – СПб.: Петербургское Востоковедение, 2000. – 400 с.
2. **Вуглік, І. Р.** Час у міфе / І. Р. Вуглік // Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўнік / рэдкал.: С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск: Беларусь, 2006. – С. 550–551.
3. **Домников, С. Д.** Мать-земля и Царь-город. Россия как традиционное общество / С. Д. Домников. – М.: Алетейа, 2002. – 672 с.
4. **Замовы** / уклад.: У. А. Васілевіч, Л. М. Салавей; уступ. арт. Л. М. Салавей. – Мінск: Беларусь, 2009. – 519 с.
5. **Левкиевская, Е. Е.** Славянский оберег. Семантика и структура / Е. Е. Левкиевская. – М.: Индрик, 2002. – 336 с.
6. **Легенды і паданні** / склад. М. Я Грынблат, І. І. Гурскі; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.
7. **Радзіны:** Абрад. Песні / уклад. і сістэм. тэкстаў Г. А. Пятроўскай, апісанне абрадаў Т. І. Кухаронак, уступ. арт. і камент. Г. А. Пятроўскай, Г. В. Таўлай, Т. І. Кухаронак; рэдкал.: А. С. Фядосік [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 637 с.
8. **Толстая, С. М.** Время / С. М. Толстая // Славянские древности: этнолингв. словарь: в 5 т. / под общей ред. Н. И. Толстого. – Т. 1: А – Г. – М.: Междун. отношения, 1995. – С. 449 – 452.
9. **Толстая, С. М.** Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М.: Индрик, 2000. – 600 с.
10. **Чарадзейныя казкі** / рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – Ч. І. – 648 с.
11. **Элиаде, М.** Священное и мирское / М. Элиаде; пер. с фр., предисл. и коммент. Н. К. Горбовского. – М.: Изд-во МГУ, 1994. – 144 с.



Падпісана да друку 10.11.2010. Папера афсетная. Фармат 60x84 1/8. Гарнітура «Verdana». Друк афсетны.
Фіз. друк. арк. 12. Ум. друк. арк. 11,16. Ул.-выд. арк. 8,7. Тыраж 2678 экз. Зак. 2925
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі СМІ №709 ад 30.07.2010.
Адрас рэдакцыі: 220023, Мінск, вул. Макаёнка, 12.
Афіцыйны сайт у Інтэрнэце www.n-asveta.com, адрас электроннай пошты info@n-asveta.com
Тэлефоны: 267-62-68, 267-64-69, 267-33-97.
Установа «Рэдакцыя газеты «Настаўніцкая газета» Філіял «Рэдакцыя часопіса «Народная асвета».

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» (ЛП № 02330/0494179 от 03.04.2009).
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ